РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЧЭРВЕНЯ 2025 г. СЕРАДА № 121 (30509)



# НА ПАРАДКУ ДНЯ — МІР І ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ

## Дзякуючы чаму Беларусі ўдаецца заставацца астраўком стабільнага спакойнага жыцця



Дзесьці на дамы падаюць ракеты, а ў Мінску пад гукі салюту выпускнікі ВНУ загадваюць жаданні, праводзячы вачыма карабель пад пунсовымі ветразямі. Гэта, бадай, самая яскравая і кантрасная карціна апошніх дзён, якая найлепш адлюстроўвае тое, што мы шчаслівыя мець, але нярэдка не заўважаем і не цэнім. Спакойная стваральная праца, бяспека дзяцей, мірнае неба — што яшчэ трэба чалавеку для шчасця? Падзеі, якія адбываюцца ў свеце, нібы падказваюць нам, беларусам: больш нічога, гэта — самае галоўнае.

І гэта галоўнае — не проста прыгожыя словы, гэта аснова дзяржаўнай палітыкі, якую ўпэўнена праводзіць Прэзідэнт нашай краіны. Пакуль палітыканы ў іншых краінах спрабуюць зарабіць сабе рэйтынг на гучных заявах, скандалах, на распальванні нянавісці і на вайне, наш кіраўнік дзяржавы заклапочаны тым, каб яго народу жылося лепш. Ён вывучае перспектывы вытворчасці дзіцячага харчавання, падпісвае ўказ аб магчымасці купіць арэнднае жыллё, праводзіць нараду па развіцці сельскай гаспадаркі, сустракаецца з расійскімі губернатарамі, каб узмацніць сувязі і тым самым захаваць працоўныя месцы і стабільную работу прадпрыемстваў. Нашы эксперты ў сваіх меркаваннях аднадушныя: менавіта таму, што Прэзідэнт надзвычай паглыблены ва ўсе аспекты жыцця краіны і яе людзей, Беларусі і ўдаецца заставацца спакойным, прыгожым, чыстым куточкам у гэтым шалёным свеце.

СТАР. 2

ЦІ ЛЁГКА ДАЧУ ЗРАБІЦЬ ДОМАМ? МС



ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНЫ ХАТНІ ПЫЛ? 13



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале **@zviazdaby**. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

НАШЫ ДЗЕЦІ

# САКРЭТ ПОСПЕХУ — ПРАЦА!

## Выпускнікі, якія набралі па выніках усіх выпрабаванняў 400 балаў з 400 магчымых, расказалі аб тым, як рыхтаваліся



Фота БелТА.

У Гродзенскай вобласці адразу чатыры чалавекі паказалі добрыя вынікі пасля заканчэння навучальных устаноў. Кожны іспыт быў вытрыманы на «сотню», а сярэдні бал атэстата таксама ва ўсіх — па 10 балаў. У цэнтры ўвагі апошнім часам Ульяна Парфёнчык з гімназіі № 1 і Эла Шлемпа з ліцэя № 1 г. Ліды, выпускніцы Ашмянскай СШ № 3 Кацярына Акушка і Гродзенскай гарадской гімназіі імя А. І. Дубко Станіслаў Герасімчык. Уражаннямі падзяліліся Кацярына і Ульяна.

СТАР. 5



Ідзе падпіска на «Звязду» на ІІІ квартал і ІІ паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

ISSN 1990 — 763X



# ПЫТАННІ ГЛАБАЛЬНЫЯ І РЭГІЯНАЛЬНЫЯ



**Сёння Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правядзе перагаворы з Прэзідэнтам Кубы Мігелем Дыяс-Канелем Бермудэсам, які знаходзіцца з афіцыйным візітам у Беларусі, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка беларускай дзяржавы.**

Сустрэча двух лідараў пройдзе ў Палацы Незалежнасці.

Аляксандр Лукашэнка і Мігель Дыяс-Канель Бермудэс абмяркуюць крокі па далейшым умацаванні двухбаковага дыялогу з акцэнтам на развіццё гандлёва-эканамічнага і навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Кіраўнікі дзяржаў разгледзяць пытанні глабальнага і рэгіянальнага парадку дня, узаемадзеянне дзвюх краін на шматбаковых пляцоўках.

Праграмай афіцыйнага візіту Прэзідэнта Кубы ў Беларусь запланаваны наведванне прадпрыемстваў машынабудаўнічай і фармацэўтычнай галін, а таксама ўдзел у Еўразійскім эканамічным форуме і пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета.

# НА ПАРАДКУ ДНЯ — МІР І ДАБРАБЫТ ЛЮДЗЕЙ

## «КАБ НА ДУШЫ Ў БЕЛАРУСАЎ БЫЛО СВЕТЛА І ЎТУЛЬНА»

«У свеце вельмі неспакойна, але мы мусім зрабіць усё, каб на душы ў беларусаў было светла і ўтульна. Усіх нас аб'ядноўвае адданасць Радзіме і адказнасць за яе лёс...» Гэтыя словы Прэзідэнт сказаў яшчэ летась, але актуальныя яны і сёння, — гаворыць



**член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, дырэктар дзяржаўнага прадпрыемства «Конус» РУП «НПЦ НАН Беларусі па механізацыі сельскай гаспадаркі» Андрэй ЖАМОЙДА.** — Інфармацыйны парадак дня насычаны рознымі падзеямі, па большай частцы негатыўнымі: войны, канфлікты. Штодня людзі вакол квітнеючай Беларусі апускаюцца ў глыбіню чалавечых пакут і болі. Вакол «палыхае зямля», але дзякуючы моцнаму лідару мы, беларусы, жывём мірным жыццём, даўно забыўшыся пра спробы навязаць нам думку, што без Захаду знікнем, што не вартыя і шэлега».

Сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з губернатарамі расійскіх рэгіёнаў сталі яскравым пацвярджэннем канструктыўных узаемаадносін з Расійскай Федэрацыяй, адзначае парламентарый і прыгадвае зусім нядаўнюю сустрэчу кіраўніка дзяржавы з губернатарам Кемераўскай вобласці: «Ёсць перакананне ў рэальнай магчымасці мець тавараабарот з Кузбасам у паўмільярда долараў. Расійская дэлегацыя пацвердзіла, што сферы аграрнай індустрыі, перапрацоўчай прамысловасці і турызму прызнаны краевугольным каменем развіцця супрацоўніцтва Брэсцкай і Кемераўскай абласцей. Праводзіцца эфектыўная работа па мультыбрэндавых цэнтрах беларускай тэхнікі, якія па даручэнні Прэзідэнта ствараюцца ў расійскіх рэгіёнах. Расійская Федэрацыя лічыць супрацоўніцтва з нашай краінай важнай для сябе мэтай».

Немалаважная падзея — Еўразійскі эканамічны форум, які рыхтуецца прымаць наша краіна 26 чэрвеня. На думку Андрэя Жамойды, тое, што на яго заяўлена больш за 2 тысячы ўдзельнікаў з 29 краін, сведчыць аб высокай цікавасці да мерапрыемства і да нашага лідара як да гаранта прадуманай і ўзважанай палітыкі».

## «ПОСПЕХІ, ЯКІЯ МЫ МАЕМ У МІРНАЙ СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ, ВЕЛЬМІ ДАРАГА КАШТУЮЦЬ»

Як звярнуў увагу **старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін СЕМЯНЯКА,** трэба адрозніваць пагрозу знешнюю ад пагрозы ўнутранай.



«Ворагі, калі імкнуцца пэўным чынам аслабіць краіну — Беларусь або любую іншую, — могуць працаваць на розных франтах, — удакладніў ён. — Могуць раптоўна напасці, а могуць рыхтаваць грамадскую думку знутры, смакаваць пэўныя цяжкасці, якія насамрэч цяжкасцямі не з'яўляюцца. Таму неабходна ўважліва сачыць за тым, каб унутры краіны працавалі прадпрыемствы, нівы давалі ўраджай, людзі мелі работу і атрымлівалі за яе пэўную ўзнагароду».

Дэпутат падкрэсліў, што ў забеспячэнні сваёй бяспекі Рэспубліка Беларусь рэалізоўвае шматвектарную палітыку. «Невыпадкова наша Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі прадугледжвае не толькі ваенную пагрозу, але і пагрозу харчовую, прамысловую, тэхналагічную, экалагічную, — заўважыў Валянцін Семяняка. — У гэтым кантэксце кіраўнік нашай дзяржавы паказвае прыклад таго, як трэба клапаціцца не толькі пра дзень сённяшні, але і пра будучыню таксама. Такая павышаная ўвага, напрыклад, да пытанняў аграпрамысловага сектара сведчыць аб тым, што менавіта дадзеная галіна з'яўляецца адным з трыгераў нашай эканомікі. Традыцыйна Беларусь — адзін з лідараў па пастаўках прадуктаў харчавання не толькі на ўнутраны рынак, але і на рынкі іншых дзяржаў. Невыпадкова гэта пытанне знаходзіцца ў полі зроку кіраўніка дзяржавы і павінна знаходзіцца ў полі зроку іншых службовых асоб, простых грамадзян».

Парламентарый прыгадаў словы Аляксандра Лукашэнкі, які неаднаразова казаў аб тым, што кожны павінен займацца сваёй справай. «Рабочыя павінны працаваць на вытворчасці, сяляне — вырошчваць сельгаспрадукцыю, настаўнікі — вучыць дзяцей, урачы — лячыць, ваеннаслужачыя — мацаваць абарону на выпадак знешняга нападу, — канкрэтызаваў парламентарый. — Гэта вельмі правільна, бо, па словах Прэзідэнта, калі кожны будзе займацца сваёй справай, будзе агульны поспех».

Дэпутат падкрэсліў, што сёння Беларусь з'яўляецца астраўком міру сярод дзяржаў, якія ваююць. «Нашы суседзі ў той ці іншай ступені ўключаны ў розныя ўзброеныя канфлікты, якія адбываюцца на зямным шары: альбо накіроўваюць сваіх вайскоўцаў ваяваць, альбо пастаўляюць зброю, альбо ваююць у адкрытую, — канстатаваў ён. — Рэспубліка Беларусь у гэтым плане з'яўляецца прыкладам таго, як за кошт стваральнай працы можна забяспечваць сваю бяспеку прагматычнымі сродкамі, мінімізаваць розныя пагрозы (як знешнія, так і ўнутраныя). І ўсё гэта на фоне значных канфліктаў, якія адбываюцца вакол нас. Мір — вельмі вялікае дасягненне, і яго трэба шанаваць кожнаму нашаму грамадзяніну. Вайна — заўсёды разбурэнне не толькі таго, што матэрыяльнае, гэта і разбурэнне глабальных сувязяў, планаў, лёсаў.

> **Любое жыццё, нават самае цяжкае, лепш, чым канец зямнога быцця. Таму нашы беларускія рэаліі, тыя поспехі, якія мы маем у мірнай стваральнай працы, вельмі дорага каштуюць. Нам зайздросцяць многія з тых, хто пайшоў па-іншаму шляху: шляхам зброі, шляхам захопу іншых тэрыторый, шляхам прэтэнзій да суседзяў. І думаю пры гэтым, што такім чынам можна стаць шчаслівымі. Шчаслівым чалавека можа зрабіць толькі стваральная, здзяйсняльная праца. Гэта дэманструе наш Прэзідэнт, уся наша беларуская нацыя».**

## «МЭТА АДНА — ЗРАБІЦЬ ЖЫЦЦЁ БЕЛАРУСАЎ ЛЕПШЫМ»

«Наш Прэзідэнт — аўтарытэтны, са шматгадовым вопытам дзяржаўны дзеяч. Чалавек, які дзякуючы сваёй настойлівасці, узважанай і адказнай унутранай і знешняй палітыцы здолеў здзейсніць неверагоднае: у сучасным свеце, дзе размовы пра трэцюю сусветную вайну сталі штодзённасцю і ўжо нікога не палохаюць, дзе ўзброеныя канфлікты рознай інтэнсіўнасці ўспыхваюць ледзь не штодня, дзе, здаецца, усе ваююць супраць усіх, Беларусь па-ранейшаму застаецца астраўком міру і стабільнасці. Дасягненне, якога не ўдавалася дабіцца нікому за ўсю шматвяковую гісторыю нашага народа», — адзначае **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар Гомельскага гандлёва-вытворчага рэспубліканскага**



**унітарнага прадпрыемства «Фармацыя» Людміла САПЕГА.**

Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова хоць бы бегла азнаёміцца з мінулым тыднем Прэзідэнта, лічыць сенатар. Выязны семінар па сельскай гаспадарцы ў Мінскім раёне, нарада па падрыхтоўцы пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета і Еўразійскага эканамічнага форуму, удзел у цырымоніі ўзнагароджання выпускнікоў і выкладчыкаў устаноў вышэйшай адукацыі...

«Мерапрыемствы розныя па сваёй тэматыцы і фармаце, але аб'ядналася адной мэтай — зрабіць жыццё беларусаў лепшым, больш якасным, насычаным, — рэзюмуе Людміла Сапега і дадае: — І больш бяспечным! Як чалавек, які пры прыняцці рашэнняў ідзе ад зямных рэалій, Прэзідэнт абараназдольнасці краіны таксама ўдзяляе павышаную ўвагу. Пацвярджэнне — яго нядаўні візіт у Брэсцкую вобласць, дзе размешчаны цэнтр падрыхтоўкі і прымянення беспілотных авіяцыйных комплексаў Узброеных Сіл Беларусі. На жаль, у сучасным свеце, дзе ўсё выразней сцвярджаецца права моцнага, інакш нельга. У адваротным выпадку заўсёды знойдуцца ахвотныя ператварыць наш астравок міру і стабільнасці ў арэну баявых дзеянняў».

## «БАЗІС ЛЮБОЙ БЯСПЕКІ — МЕНАВІТА ЭКАНОМІКА»

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі Палаты прадстаўнікоў Мікалая БУЗІНА,**



насычаны графік кіраўніка дзяржавы, які, у прыватнасці, клапоціцца аб стане сельскай гаспадаркі, бяспецы нашай краіны, плануе перспектыўныя праекты з расійскімі партнёрамі, сведчыць аб тым, што Беларусь упэўнена ў будучыні. «Наша дзяржава накіравана на развіццё, — акцэнтаваў увагу дэпутат. — Мы думаем аб тым, як зрабіць жыццё нашых людзей лепшым».

Пры гэтым Мікалай Бузін падкрэслівае, што пытанне, звязанае з нацыянальнай бяспекай, не другаснае, але яно вырашана на пэўны час наперад. «Мы ўпэўнена глядзім у будучыню, — адзначыў парламентарый. — Так, ёсць праблемы эскалацыі канфліктаў, але сучасны стан ваеннай і нацыянальнай бяспекі забяспечвае паступальнае развіццё дзяржавы, грамадства на перспектыву. Мы ведаем, што наша неба абаронена, што мы валодаем адпаведнымі сіламі і сродкамі для забеспячэння ваеннай бяспекі. І таму мы спакойна займаемся сельскай гаспадаркай, жывёлагадоўляй, развіццём тэрыторый, бо аснова, базіс любой бяспекі — менавіта эканоміка. І наш Прэзідэнт гэта дакладна разумее».

**Паводле нашых карэспандэнтаў.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# НА АСНОВЕ ДАВЕРУ, УЗАЕМНАЙ ПАВАГІ І РАЎНАПРАЎЯ



## Тысячы адзінак беларускай тэхнікі ўрачыста перадалі Нігерыі




**Цырымонія прайшла падчас візіту ўрадавай дэлегацыі на чале з намеснікам Прэм'ер-міністра Беларусі Віктарам КАРАНКЕВІЧАМ у гэту краіну. Падрабязнасці — у нашым матэрыяле.**

Урадавая дэлегацыя на чале з Віктарам Каранкевічам знаходзіцца з візітам у сталіцы Нігерыі Абуджы, паведамілі ў прэс-службе Саўміна.

Кантакты, кантракты, павага і агульны інтарэс — тое, што звязвае сёння Беларусь з многімі афрыканскімі дзяржавамі. Нягледзячы на адлегласць, краіны на розных кантынентах разумеюць, што Беларусь не абмяжоўваецца экспартам сваіх тавараў, дыялог будуецца на партнёрскіх адносінах на ўзаемавыгадных умовах.

Дзясяткі мясцовых СМІ, сустрэчы і перамовы «на нагах», абмеркаванне актуальных пытанняў: ад адукацыі да гандлю. І, вядома, асаблівы гонар за нашу краіну, прамысловасць і яе магчымасці.

Чырвоная стужачка перарэзана — Беларусь уручыла Прэзідэнту Нігерыі Бола Цінубу сімвалічны ключ як знак таго, што першы этап «дарожнай карты» завершаны. Кіраўнік афрыканскай дзяржавы сказаў, што гэта толькі пачатак.

Віктар Каранкевіч таксама перадаў Прэзідэнту Нігерыі запрашэнне нашага Прэзідэнта наведаць Беларусь, і Бола Цінубу яго прыняў.

Віктар Каранкевіч назваў гэта важнай падзеяй у гісторыі двухбаковых адносін Беларусі і Нігерыі:

— Адбылася афіцыйная перадача беларускай тэхнікі ў рамках рэалізацыі «дарожнай карты», падпісанай паміж Міністэрствам сельскай гаспадаркі і харчовай бяспекі Нігерыі і Урадам Рэспублікі Беларусь, якая дала вынік у рамках рэалізацыі першага этапу. Гэта вельмі важная падзея ў гісторыі двухбаковых адносін. У далейшым гэта будзе значным унёскам ва ўмацаванне харчовай бяспекі Нігерыі, павышэнне дабрабыту грамадзян гэтай краіны.

Паводле слоў намесніка Прэм'ер-міністра Беларусі, гэта толькі пачатак: у адпаведнасці з «дарожнай картай» мяркуецца рэалізацыя другой і трэцяй фаз, у рамках якіх будуць ствараецца сучасныя сэрвісныя цэнтры з мабільнымі брыгадамі, якія забяспечаць абслугоўванне і рамонт тэхнікі. Таксама прадугледжваецца стварэнне зборачных вытворчасцяў беларускай тэхнікі ў Нігерыі.

Віктар Каранкевіч звярнуў увагу на вялікую колькасць удзельнікаў у цырымоніі па перадачы тэхнікі з нігерыйскага боку:

— З боку ўрада, а самае галоўнае — непасрэдным удзелам прэзідэнта Нігерыі. Гэта яшчэ раз падкрэслівае, якое значэнне надаецца рэалізацыі двухбаковых адносін. Такая ж увага ўдзяляецца з боку кіраўніка нашай дзяржавы, бо ўсе пытанні рэалізацыі «дарожнай карты» знаходзіліся пад асаблівым кантролем Прэзідэнта. І гэта закладзеная аснова сяброўскіх, я б сказаў брацкіх адносін паміж нашымі краінамі, якія выстройваюцца на даверы, узаемнай павазе і раўнапраўі.

Як расказаў прадстаўнік кампаніі Aftrade Алег Водчыц, падрыхтоўка кантракта заняла працяглы перыяд:

— Гэта доўгая працэдура, бо канкурэнцыя на рынку Афрыкі вельмі сур'ёзная, а ў Нігерыі асабліва. Тут ёсць вялікі патэнцыял у развіцці сельскай гаспадаркі. З моманту падрыхтоўкі кантрактаў да дастаўкі тэхнікі і да сённяшняга мерапрыемства прайшоў роўна год.

Паводле слоў спецыяліста, заваяваць павагу ў нігерыйскага спажыўца беларуская тэхніка змагла за кошт сваіх пераваг, якія заключаюцца ў суадносінах «кошт-якасць»:

— І самая важная наша перавага — мы адны з нямногіх, хто прапануе комплекснае рашэнне. Хтосьці можа прапанаваць трактары, хтосьці — камбайны, а мы — паставіць цалкам, комплексна і закрыць пытанне для Міністэрства сельскай гаспадаркі Нігерыі. Ад пачатку і да канца.

ЕЎРАЗІЙСКАЯ ІНТЭГРАЦЫЯ

# ЗАДАЧЫ ДЛЯ «ПЯЦЁРКІ»

## Бесперашкодны доступ на рынак дзяржзакупак, прызнанне лічбавага подпісу і новыя інструменты антыманапольнага рэагавання



**Ужо зусім хутка — 26—27 чэрвеня — у Мінску адбудзецца IV Еўразійскі эканамічны форум, галоўная тэма якога — «Стратэгія Еўразійскай эканамічнай інтэграцыі: вынікі і перспектывы». Форум прымеркаваны да пасяджэння Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета з удзелам кіраўнікоў дзяржаў. З якімі ключавымі выклікамі сутыкаюцца канкурэнтныя органы на сучасным этапе, якія існуюць механізмы, неабходныя для забеспячэння справядлівай канкурэнцыі, у ходзе відэамоста MIA Sputnik Мінск — Астана — Бішкек — Ерэван — Масква расказаў міністр па канкурэнцыі і антыманапольным рэгуляванні Еўразійскай эканамічнай камісіі Максім ЕРМАЛОВІЧ.**



### ПРЫЯРЫТЭТНАЯ МЭТА

Падчас відэамоста была закранута актуальная тэма доступу краін-удзельніц да агульнага рынку дзяржзакупак. Профільны міністр адзначыў, што статыстыка ўзаемных паставак абавязвае ЕЭК больш актыўна працаваць на гэтым полі, здымаць рознага роду абмежаванні і перашкоды, у тым ліку і лічбавыя, для таго каб забяспечваць бесперашкодны доступ да рынку дзяржзакупак краін-удзельніц. Ён дадаў, што на долю дзяржаўных закупак у саюзе, якія праводзяць краіны за кошт сваіх бюджэтаў, на ўзаемныя пастаўкі краін ЕАЭС прыпадае менш за 1 %. Прытым што напалову попыт на тавары і паслугі ў рамках дзяржзакупак задавальняецца за кошт імпарту з трэціх краін.

— У гэтай сітуацыі задача па развіцці рынку дзяржаўных закупак, па яго спрашчэнні, стварэнні механізмаў бесперашкоднага доступу — ключавая задача ўсяго саюза. Гэты кірунак пазначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам, які старшынствуе сёлета ў саюзе, як адна з асноўных (задач. — **Заўв. аўт.**), што абавязвае нас стварыць неабходныя механізмы па доступе краін саюза да дзяржаўных закупак адна адной.

Максім Ермаловіч адзначыў, што адным з кірункаў работы з'яўляецца прызнанне банкаўскіх гарантый:

— У гэтым кірунку зроблена шмат, падпісана адпаведнае пагадненне. Ужо ёсць прыклады, дзе такія прызнанні дзейнічаюць.

На яго думку, неабходна пашыраць практыку работы па пагадненні на ўсе пяць краін саюза, павялічваць колькасць банкаў, якія ўдзельнічаюць у гэтым працэсе.

— Тут мы бачым пазітыўную дынаміку. Не хацелі б спыняцца і будзем працягваць развіваць усе неабходныя інструменты гарантыйнага пацвярджэння дзяржаўных закупак, — дадаў Максім Ермаловіч.

Што датычыцца прызнання электроннага лічбавага подпісу, ён адзначыў, што сітуацыя больш складаная:

— У камісіі мы распрацавалі правілы прызнання электроннага лічбавага подпісу, выдадзеныя ў адпаведнасці з заканадаўствам краін — удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза. Але сутыкнуліся з цэлым шэрагам пытанняў, звязаных з забеспячэннем нацыянальных стандартаў прымянення гэтага лічбавага подпісу.

Ён выказаў упэўненасць, што з часам усе перашкоды будуць пераадолены.

— На сёння Беларусь і Расійская Федэрацыя адпрацоўваюць механізмы прызнання электроннага лічбавага подпісу на «двойку», маюць дастаткова вялікі досвед работы ў гэтым кірунку. Спадзяюся, што з удзелам нашых калег з Беларусі і Расіі мы здолеем знайсці кансэнсуснае рашэнне і на «пяцёрку» і адпрацаваць усе неабходныя механізмы для таго, каб прызнаваць электронны лічбавы подпіс, выдадзены ў адпаведнасці з заканадаўствам краін ЕАЭС.

### ПАПЯРЭДЗІЦЬ ЛЯГЧЭЙ, ЧЫМ ВЫПРАЎЛЯЦЬ НАСТУПСТВЫ

Ацэньваючы механізмы антыманапольнага рэгулявання з боку ЕЭК, Максім Ермаловіч адзначыў, што інструментарый дастатковы, але з'яўляюцца і новыя спосабы:

— Мы актыўна абмяркоўваем увядзенне новых інструментаў рэгулявання, асабліва гэта датычыцца рэгулявання лічбавага гандлю.

Паводле яго слоў, сёння многія пытанні аднесены да нацыянальнай кампетэнцыі, і ў ЕЭК асцярожна падыходзяць да пашырэння сваіх паўнамоцтваў, каб быць упэўненымі ў эфектыўнасці новых механізмаў.

— Вялікая работа таксама будзе па фарміраванні агульнага біржавога рынку, — адзначыў спікер. — Гэта сапраўды новы крок у развіцці канкурэнцыі, калі на агульным рынку як адзінае цэлае пачнуць узаемадзейнічаць біржы краін саюза, што таксама азначае і фарміраванне цэнавых індэксаў у перспектыве, якія будуць з'яўляцца арыенцірамі ў нашай рабоце.

Профільны міністр падкрэсліў, што і новыя механізмы кантролю за станам канкурэнцыі будуць паспяхова рэалізаваны ў рабоце камісіі:

— У прыватнасці, мы цяпер разглядаем розныя варыянты прафілактыкі правапарушэнняў у сферы канкурэнцыі. Гэта будзе накіравана на выдачу папярэджанняў нават у тых выпадках, калі яны яшчэ не адбыліся, але мы бачым сур'ёзныя перадумовы, каб такія парушэнні маглі з'явіцца, каб іх папярэдзіць.

Што датычыцца колькасці зваротаў у антыманапольную службу ЕЭК, Максім Ермаловіч растлумачыў: штогод разглядаецца каля 19-20 выпадкаў парушэння агульных правілаў канкурэнцыі.

— Гэта досыць працяглы працэс, які прадугледжвае запыт і аналіз інфармацыі з боку ўсіх суб'ектаў рынку ў пяці краінах саюза. Таму кожны раз, калі прыступаем да разгляду заявы, мы павінны правесці глыбокі аналіз рынку адпаведнага тавару ці паслугі. На падставе гэтага аналізу мы павінны выявіць прыкметы парушэнняў, вызначыць механізмы іх ліквідацыі, пры неабходнасці прыцягнуць вінаватага да адказнасці, — растлумачыў ён.

Анансуючы парадак дня, профільны міністр адзначыў, што на форуме будуць прадстаўлены спікеры з 26 краін свету. Адказваючы на пытанне аб прадстаўніцтве Ірана як дзяржавы — назіральніцы ЕАЭС, Максім Ермаловіч растлумачыў, што чакаецца ўдзел прадстаўнікоў гэтай краіны на самым высокім узроўні.

— Паводле інфармацыі на ўчора (23 чэрвеня. — **Заўв. аўт.**), свой удзел пацвердзіў прэзідэнт Ірана. Што датычыцца ўдзелу на форуме, то мы чакаем вялікую дэлегацыю. З улікам бягучай сітуацыі мы спадзяёмся, што дэлегацыя Ірана прыме ўдзел у поўным складзе. Чакаем міністра прамысловасці, руднікоў і гандлю, павінен таксама прысутнічаць на нашых мерапрыемствах міністр транспарту, кіраўнік арганізацыі па садзейнічанні экспарту Ісламскай Рэспублікі Іран і шматлікія прадстаўнікі розных іранскіх ведамстваў, якія традыцыйна ўдзельнічаюць у нашых мерапрыемствах.

**Маргарыта ЗАРОЎКІНА.**

ВЕКАПОМНАЕ

# «БАГРАЦІЁН»: ГІСТАРЫЧНЫ ВОПЫТ ПРАЗ ПРЫЗМУ СУЧАСНАСЦІ

## Чарговыя парламенцкія чытанні прайшлі ў Ваеннай акадэміі

Іх тэма — «Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён». Патрыятычна-асветніцкі праект, ініцыяваны дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў з нагоды 80-годдзя Вялікай Перамогі, выйшаў за рамкі парламенцкага дыялогу. Ваенныя навукоўцы далучыліся да дэпутатаў і з афіцэрскага пункту гледжання паразважалі аб асаблівасцях планавання і рэалізацыі аперацыі «Баграціён», ролі партызан у яе ажыццяўленні, прывялі малавядомыя факты, падзяліліся ўласнымі сямейнымі гісторыямі, якія яшчэ раз пацвярджаюць, што няма той сям'і, якую б не закранула Вялікая Айчынная вайна.

У размове з журналістамі **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА** адзначыў, што месца правядзення чарговых парламенцкіх чытанняў было выбрана невыпадкова. «Ваенная акадэмія — гэта вядучая навучальная ўстанова краіны, якая ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў для Узброеных Сіл, унутраных войскаў, — адзначыў Ігар Сергяенка. — Знаходзячыся ў акадэміі, мы прайшліся па класах і паглядзелі, якіх цяпер рыхтуюць афіцэраў. Сучасны бой — вядома, не бой Вялікай Айчыннай вайны. Сёння Ваенная акадэмія — гэта не толькі вядучая ваенная ВНУ краіны, але і вядучая кузня кадраў па шэрагу кірункаў. У першую чаргу па тэхнічных спецыяльнасцях займае вядучыя пазіцыі ў сістэме вышэйшай адукацыі нашай краіны. Тыя напрацоўкі, якія нараджаюцца тут, выкарыстоўваюцца далёка за межамі Міністэрства абароны».



**Удзельнікі чытанняў ушанавалі памяць савецкіх воінаў, партызан, ваеннапалонных і мірных грамадзян, расстраляных і закатаваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1941—1943 гадах, — да абеліска, размешчанага на 9-м кіламетры Маскоўскай шашы, ляглі вянок і кветкі.**

Па словах **старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Ігара МАРЗАЛЮКА,** вайна — гэта заўсёды вайна інтэлектаў. «Мяняюцца толькі тэхнічныя магчымасці, і з тым, хто не паспявае за імі, адбываюцца вельмі сумныя рэчы, калі даходзіць да гарачай фазы канфлікту, — канстатаваў дэпутат. — Ваенная акадэмія імкнецца ісці ў нагу з часам, ідзе апераджальнымі тэмпамі. Кожны з гэтых хлопцаў — залаты фонд краіны, тыя, хто стварае прадукт, які дапамагае эфектыўна перамагаць».

Пры гэтым парламентарый падкрэсліў, што ў Беларусі абсалютна мірная палітыка. «Мы ні з кім не збіраемся ваяваць, але разам з тым павінны быць гатовы да любой сітуацыі, тым больш у цяперашні час — у эпоху постпраўды, посткаштоўнасцяў, калі абясцэньваецца чалавечае жыццё, паняцце міру, калі асобныя разумнікі заяўляюць, што ў ядзерным канфлікце трэба перамагчы, — удакладніў ён. — У нас ёсць свае сэнсы, свае каштоўнасці. І галоўная абсалютная каштоўнасць Беларусі — наша суверэнная краіна, якую мы не хочам падвяргаць ваеннай небяспецы. Для гэтага нам неабходны высакаякасныя Узброеныя Сілы, якія абапіраюцца на памяць, вопыт мінулых баявых дзеянняў. Разам з тым разумеем, што без адэкватнай падрыхтоўкі Узброеных Сіл — ад простага салдата да тэхналогій — немагчыма будзе эфектыўна абараняць сваю краіну».

**Вераніка КАНЮТА.**

**Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.**

ПА ЗАКОНЕ

# «НЕДАТЫКАЛЬНЫХ НЯМА»

## Генпракурор пра жорсткую і прынцыповую рэакцыю на карупцыйныя злачынствы



Рэакцыя на карупцыйныя злачынствы павінна быць жорсткай і прынцыповай, адзначыў генеральны пракурор Беларусі Андрэй ШВЕД перад пасяджэннем Рэспубліканскай каардынацыйнай нарады па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, на якой разглядалася пытанне эфектыўнасці мер, што прымаюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па процідзеянні карупцыі, паведаміла БелТА.

«Усім відавочна, што чыноўнік, які павяз у карупцыі і думае толькі аб нажыве, не будзе абараняць дзяржаву. Ён не будзе думаць аб простых людзях», — заўважыў Андрэй Швед, падкрэсліўшы, што такія праявы патрабуюць, як адзначаў Прэзідэнт, жорсткай, прынцыповай рэакцыі.

Генпракурор указаў на адсутнасць недатыкальных. Да крымінальнай адказнасці прыцягваюцца кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў. «І міністры, і намеснікі міністраў, і кіраўнікі буйных прадпрыемстваў», — удакладніў ён, дадаўшы, што грамадства аб гэтым інфармуецца.

«На жаль, сёння ў аператыўнай распрацоўцы знаходзяцца матэрыялы адносна такой катэгорыі асоб», — сказаў ён.

Барацьба з карупцыяй — прыярытэтны кірунак работы не толькі праваахоўных органаў, але і ўсяго грамадства, лічыць генпракурор. Прэзідэнт неаднаразова падкрэсліваў той факт, што беларускія людзі атрымалі ў свой час вакцыну нецярпімасці да праяў карупцыі. «Наша задача з пункту гледжання ў тым ліку прафілактыкі — імунітэт беларускага грамадства, нецярпімасць падтрымліваць на самым высокім узроўні», — адзначыў Андрэй Швед.

Паводле яго слоў, апошнія некалькі гадоў узровень злачыннасці карупцыйнай накіраванасці знізіўся прыкладна на трэць. Выяўляецца ў сярэднім крыху больш за тысячу злачынстваў, звязаных з карупцыяй. Да крымінальнай адказнасці прыцягваюцца ад 820 да 850 службовых асоб за год.

Разам з тым аб самазаспакаенні гаворкі быць не можа, падкрэсліў генпракурор. Кіраўнік нагляднага органа звярнуў увагу на прафілактыку, адзначыўшы наяўнасць недахопаў у рабоце з падборам і расстаноўкай кадраў. На гэтыя пытанні звяртаў увагу і кіраўнік дзяржавы.

Андрэй Швед паведаміў, што найбольшая колькасць злачынстваў карупцыйнай накіраванасці ўчыняецца ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, будаўніцтве, гандлі. Адзначаючы іншыя тэндэнцыі, генпракурор акцэнтаваў увагу на тым, што формы і метады злачыннай дзейнасці ўдасканальваюцца. Усё часцей, па матэрыялах крымінальных спраў, фіксуюцца факты атрымання хабару ў крыптавалюце, з выкарыстаннем электронных кашалькоў. Злачынцы спрабуюць канспіраваць сваю дзейнасць, прымяняюць найноўшыя сродкі, у тым ліку шыфраванні ў месенджарах. Але праваахоўныя органы заўсёды на крок наперадзе ў гэтым пытанні.

# СКРЫЖАВАННЕ

Рэспубліканскае свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў») сёлета рыхтуецца прымаць удзельнікаў у шаснаццаты раз. Культурны форум пройдзе 5 ліпеня ў фармаце аднаго дня. Удзел у ім возьмуць як беларусы, так і шматлікія госці з 29 рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі. Упершыню на фестывалі будуць прадстаўлены Башкартастан, Сахалінская і Амурская вобласці. Падрабязней пра адметныя мерапрыемствы, цікавыя лакацыі і новыя фарматы расказалі арганізатары свята.

## ЗОРНЫЯ ГОСЦІ І НЕ ТОЛЬКІ

Святкаванне Купалля на радзіме кіраўніка дзяржавы ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна з кожным годам набывае ўсё большыя маштабы, аб'ядноўвае гасцей і ўдзельнікаў у атмасферы творчасці, дае нагоду для душэўных сустрэч, спазнання культурных традыцый. Арганізатары фестывалю рыхтуюць для гасцей цікавую праграму з адметнымі акцэнтамі. Так і сёлета на беразе Дняпра лакацыю для адпачынку змогуць знайсці і дарослыя, і дзеці.

— Асноўныя тэмы свята — 80-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, адзінства народаў Беларусі і Расіі і традыцыйныя сямейныя і агульначалавечыя каштоўнасці, — расказала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік упраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Іна АДАМОВІЧ.** — Галоўнымі падзеямі стануць вячэрні гала-канцэрт «Кінатэатр «Александрыя», выстаўка-кірмаш «Купальскае дрэва жыцця», прэзентацыйныя пляцоўкі, выстаўкі праектаў лаўрэатаў прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і грантаў у сферы культуры Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за мінулы год. Праграма стартуе ў 11 гадзін, а ў 13.00 пройдзе ўрачыстая цырымонія адкрыцця. У трэці раз у пашыраным фармаце ў рамках фестывалю адбудзецца мерапрыемства «Саюзная дзяржава на Купаллі» з правядзеннем гала-канцэрта «Саюзныя зоркі ў гасцях у Александрыі». З расійскага боку запрошаны такія выканаўцы, як Зара, Марына Дзевятава, Іван Дзятлаў і іншыя. З беларускага боку ўдзельнічае ўраджэнец Магілёўшчыны, цудоўны артыст Пётр Ялфімаў. Неба ўпрыгожыць традыцыйны дэманстрацыйны палёт клуба ДАСААФ. Адбудзецца шмат іншых цікавых мерапрыемстваў.

## КІНАХІТЫ І ТВОРЧЫЯ ПАДВОРКІ

Адной з яркіх падзей фестывалю, вядома, будзе канцэрт з назвай «Кінатэатр «Александрыя», які распачнецца ўвечары. Па задумцы рэжысёра Агаты Мацко, ён пройдзе ў фармаце мюзікла з элементамі інтэрактыву, дзе ў аснову пакладзена тэма кіно. Адпаведна і рэпертуар складуць папулярныя кампазіцыі з кінафільмаў, але ў новай, свежай інтэрпрэтацыі. На сцэне ўбачым заслужаных артыстаў Беларусі Аляксандра Саладуху, Вікторыю Алешка, Алену Ланскую, Юлію Быкаву, Руслана Аляхно і іншых. Да іх далучацца і народныя артысты Анатоль Ярмоленка, Уладзімір Громаў, арт-група «Беларусы», дуэт баяністаў «НеБа Sound», акцёры сталічных тэатраў, а таксама калектывы Магілёўшчыны.

На пляцоўцы «Купальскае дрэва жыцця» размесцяцца падворкі рэгіёнаў Магілёўскай вобласці і Расійскай Федэрацыі. Будуць працаваць майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і радаваць сваімі выступленнямі творчыя калектывы з усіх абласцей нашай краіны і сталіцы. А завяршальным акордам святочнага дзейства стане яркі феерверк і запальванне купальскага вогнішча на беразе Дняпра. Моладзь традыцыйна запрашаюць на дыскатэку.

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# АД МІНСКА ДА ПЕКІНА

## У сталіцы праходзіць першы Беларуска-кітайскі маладзёжны форум

Адпаведная ідэя нарадзілася год таму на форуме рэктараў нашай краіны і Кітая. Тады ў мерапрыемстве ўзялі ўдзел больш за 40 універсітэтаў. Запамінальнай стала сустрэча прадстаўнікоў вядучых беларускіх і кітайскіх ВНУ з кіраўніком нашай дзяржавы, дзе ён прапанаваў правесці маладзёжны форум паміж дзвюма краінамі.



Падрыхтоўка да форуму вялася год, і вось прадстаўнічая кітайская дэлегацыя — на беларускай зямлі. Адкрыццё форуму адбылося ўчора, арганізатарамі выступілі дзве вядучых ВНУ дружалюбных краін — БДУ і Пекінскі ўніверсітэт (ПКУ). А пляцоўку пад правядзенне мерапрыемстваў прадаставіў Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк.

Удзельнікамі мерапрыемства сталі каля 200 студэнтаў з больш як 30 беларускіх і 11 кітайскіх ВНУ. Гэта таленавітая моладзь — магістранты, аспіранты, маладыя навукоўцы, прадстаўнікі органаў студэнцкага самакіравання Беларусі і Кітая. Падтрымаць моладзь прыехалі **першы намеснік міністра замежных спраў Сяргей ЛУКАШЭВІЧ, першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр БАХАНОВІЧ, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі ЧЖАН Вэньчуань,** кіраўнікі беларускіх і кітайскіх ВНУ.

Трохдзённая праграма форуму стартавала цырымоніяй ускладання кветак да стэлы «Мінск — горад-герой». Пасля ўрачыстага адкрыцця, з пасяджэння тэматычнага круглага стала «Вопыт універсітэтаў Беларусі і Кітая ў рабоце з таленавітай моладдзю і рэалізацыі маладзёжных ініцыятыў» пачаліся асноўныя дзелавыя мерапрыемствы, у якіх удзельнічалі кіраўнікі запрошаных ВНУ. У рамках выставы інавацыйных распрацовак маладых даследчыкаў дзвюх краін адбыліся прэзентацыі навуковых работ у самых розных сферах — ад медыцыны да космасу. Акрамя таго, удзельнікі наведалі фарсайт-сесію па прыярытэтных пытаннях супрацоўніцтва маладых вучоных Беларусі і КНР. Дыскусія закранула перспектывы пашырэння навуковага ўзаемадзеяння, ролі навуковых супольнасцяў і асацыяцый маладых навукоўцаў у наладжванні кантактаў паміж дружалюбнымі краінамі, а таксама спосабы павышэння кампетэнцый навучэнцаў у галіне міжнародных сувязяў, кіравання праектамі і камерцыялізацыі інавацый.

Не менш значнай часткай праграмы стаў эўрыстычны занятак рэктара БДУ Андрэя Караля. Ён арыентаваў студэнтаў на стваральную працу ў рамках міжнацыянальных каманд, вынікам якой стала распрацоўка навучэнцамі канцэпцый супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Кітаем у розных галінах. Скончыўся дзень таварыскім баскетбольным матчам. Сёння госці з Паднябеснай знаёмяцца з культурна-гістарычнай спадчынай Беларусі — для ўдзельнікаў форуму арганізаваны экскурсіі ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», а таксама Нацыянальны парк «Белавежская пушча».

**Алена ВІНАГРАДАВА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

# САКРЭТ ПОСПЕХУ — ПРАЦА!

## РЫХТАВАЛАСЯ ЗАГАДЗЯ



Кацярына АКУШКА здавала ЦЭ па рускай і англійскай мовах, а таксама ЦТ па матэматыцы. Яскраваму поспеху папярэднічала вялікая праца. Дзяўчына праходзіла рэпетыцыйныя тэсціраванні: руская ішла добра, а вось вынік па матэматыцы і англійскай мове не спадабаўся — не набралася і 70 балаў. У засмучэнне гэта не прывяло, наадварот, дало стымул рыхтавацца яшчэ больш старанна, і ўжо на наступных этапах па мовах былі «сотні», а па матэматыцы 98 балаў. Дарэчы, Кацярына пачала хадзіць на РТ яшчэ ў 9 класе.

— У школе выкладчыкі адказна падыходзілі да сваёй працы і добра нас рыхтавалі, але пры гэтым я займалася з рэпетытарамі і вельмі шмат самастойна. Падрыхтоўку пачала загадзя, бо выдатна разумела, што толькі ад мяне залежыць, як я спраўлюся. Шчыра прызнаюся, вольнага часу было вельмі мала, часта заседжвалася дапазна. Мама, вядома, перажывала і перыядычна спрабавала адправіць мяне спаць, але я прызвычаілася даводзіць пачатыя справы да канца. Тым больш разумела, што без высокіх балаў у мяне не будзе шанцу паступіць туды, куды хачу. Мінулым летам вырашыла паступаць у БДУ на спецыяльнасць «Сусветная эканоміка», а там прахадны бал — 395. Не скажу, што я сябе настройвала менавіта на 100 балаў па кожным ЦТ, паставіла мэту зрабіць усё магчымае. Складана апісаць словамі ўвесь спектр эмоцый, якія адчула, калі даведалася вынік апошняга тэсціравання!

Намеры наконт паступлення ў ВНУ ў дзяўчыны не змяніліся, яна з нецярпеннем чакае пачатку вучобы ва ўніверсітэце. Кацярына таксама адзначыла, што на вынік уплывае і сістэмнасць. Толькі рэгулярныя заняткі могуць сфарміраваць трывалы падмурак для ведаў.

## ДАКЛАДНА ІШЛА ДА МЭТЫ



А вось Ульяна ПАРФЁНЧЫК мэтанакіравана ішла да 100 балаў. У 11 класе вырашыла, што хоча атрымаць максімальны вынік па грамадазнаўстве, рускай і англійскай мовах. Для дзяўчыны ўвогуле звыкла ставіць сур'ёзныя мэты. Напрыклад, ужо ў першым класе вырашыла, што хоча скончыць гімназію з залатым медалём. Так і сталася.

— Вядома, хадзіла на РТ і здавала іх на 100 балаў. Гэта надавала ўпэўненасці ў сваіх сілах, але хваляванне ўсё роўна прысутнічала. Іспыты — вельмі адказны этап у жыцці кожнага чалавека. Я самастойна рыхтавалася і займалася з выкладчыкамі, каб быць абсалютна ўпэўненай у сваіх ведах. Звярталася таксама да рэпетытараў. Выказваю шчырую ўдзячнасць усім маім настаўнікам. Ніякага чароўнага сакрэту майго поспеху няма, гэта таямніца даступная кожнаму: упартая праца і імкненне дасягаць сваіх мэт. І я вельмі рада, што ў мяне атрымалася дасягнуць іх. Даказала ў першую чаргу сама сабе, што шмат на што здольная. Але пры гэтым стаche старалася не толькі вучыцца, а размяркоўваць час так, каб хапіла на грамадскую дзейнасць і адпачынак.

Дзяўчына яшчэ ў 9 класе вырашыла, што жадае быць юрыстам. Ёй падабалася грамадазнаўства, ды і старэйшая сястра звязала сваё жыццё з гэтай сферай. Ульяна назірала за ёй, цікавілася. Ажыццявіць сваю мару Ульяна хоча ў БДУ на спецыяльнасці «Правазнаўства».

Мары, несумненна, спраўджваюцца, але недастаткова проста быць летуценнікам і ставіць высокія мэты. Важны інгрэдыент поспеху — упартая праца. Гэта з году ў год дэманструюць хлопцы і дзяўчаты па ўсёй краіне, паказваючы высокія вынікі на іспытах і ЦТ.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ТРАДЫЦЫЙ І СЯБРОЎСТВА

## ДАРОГАМІ ПАМЯЦІ І СТАНДАРТАЎ

Як адзначыў **начальнік упраўлення культуры Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр ЖЫГУН**, запланавалі арганізатары і шэраг лакацый, дзе прысутныя змогуць пранікнуцца атмасферай і маштабам свята:

— Сумесна з Міністэрствам культуры і з рэспубліканскімі органамі ўлады мы прынялі ўсе неабходныя меры для таго, каб свята «Купалле» адбылося на высокім і мастацкім, і арганізацыйным узроўні. Сёлета схема размяшчэння на пляцоўцы застаецца ранейшай, але яе памеры павялічыліся да 10 гектараў. Будзе прадстаўлена 180 суб'ектаў гандлю, шмат гандлёвых пунктаў забяспечаць арганізацыю харчавання ўдзельнікаў мерапрыемства. Прадугледжана 33 тысячы месцаў для размяшчэння людзей, каб у кожнага была магчымасць і атрымаць асалоду ад беларускай кухні, і наведаць мерапрыемствы.

Сёлета рыхтуюцца сустракаць наведвальнікаў новыя пляцоўкі «Зроблена ў Беларусі» і «Дзяржстандарт», дзе прадставяць мадэльны рад кампаніі «МАЗ», тэхніку «Белджы» і Мінскага трактарнага завода. Адметным акцэнтам стане таксама пляцоўка, прысвечаная 80-годдзю Перамогі. На свяце прэзентуюць праект «Дарогамі памяці», які атрымаў спецпрэмію кіраўніка дзяржавы дзеячам культуры і мастацтва. Там наведвальнікі ўбачаць два аўтобусы: у адным прэзентаваны «80 рэліквій Перамогі», а ў другім размясцілася экспазіцыя, якая адлюстроўвае ўнёсак моладзі ў Перамогу. Варта паглядзець і на выставачны праект па рэканструкцыі культуры і побыту партызан Заходняга Палесся. Альбо наведаць побач пляцоўку ўстаноў адукацыі «Усё для Перамогі», каб пазнаёміцца з прафесіямі, якія былі запатрабаваныя на Магілёўшчыне ў ваенны час.



## ІНТЭРАКТЫЎ СЯМЕЙНАГА ФАРМАТУ

Не застануцца без увагі і самыя юныя наведвальнікі свята. Іх чакаюць і плануюць радаваць у цырку-шапіто, у тэатры лялек і ў палявым кінатэатры (пляцоўка арганізавана сумесна з «Беларусьфільмам»). Будуць працаваць і аніматары, ствараючы добры настрой гасцям.

Цікавую пляцоўку з рознымі відамі інтэрактыву прапаноўвае штогод Магілёўскае абласное ўпраўленне Дэпартамента аховы. Тут можна наведаць лазерны цір, паназіраць за работай кінолагаў альбо пакатацца на электрамабілях. Словам, далучайцеся і святкуйце з размахам!

**Алена ДРАПКО.**

ТЭНДЭНЦЫІ

# СПАЖЫВЕЦКІ ПОПЫТ РАСЦЕ, ЯК І ДАХОДЫ

## Еўразійскі банк развіцця павысіў прагноз росту эканомікі Беларусі ў 2025 годзе да 3 %



**Па словах старшага аналітыка Цэнтра краінавага аналізу Дырэкцыі па аналітычнай рабоце ЕАБР Антона Далгавечнага, гэта стала магчымым дзякуючы моцным вынікам пачатку года і чаканаму пашырэнню крэдытнай падтрымкі інвестыцый, паведамляе БелТА.**

ЕАБР раней прагназаваў, што ў 2025 годзе беларуская эканоміка прырасце на 2,6 %. Цяпер банк павысіў прагноз да 3 %. У 2026—2027 гадах ЕАБР чакае росту ВУП Беларусі на 1,7 %. «Пасля істотнага росту ВУП у 2023—2024 гадах Беларусь сёлета таксама захоўвае павышаныя тэмпы развіцця эканомікі. Ужо за студзень—май мы бачым, што гэта вышэй за сярэднія тэмпы апошніх 15 гадоў. Рост эканомікі фарміруецца за кошт унутранага попыту. Рознічны тавараабарот вырас на 9,3 %, інвестыцыі ў асноўны капітал — больш як на 14 %. Пры гэтым назіраецца запаволенне росту ў прамысловасці, якая была асноўным драйверам у апошнія некалькі гадоў. Росту ВУП Беларусі ў 2025 годзе будзе садзейнічаць далейшае павелічэнне спажывання, якое падтрымае заработная плата і спажывецкае крэдытаванне. Акрамя таго, працягне пашырацца інвестыцыйная актыўнасць. Тут драйверам будзе выступаць рэалізацыя дзяржаўных праграм і спрашчэнне доступу да крэдытавання інвестыцыйных праектаў. Падтрымку росту эканомікі акажа і дынамічнае аднаўленне ІТ-сектара», — сказаў Антон Далгавечны.

Нагадаем, ВУП Беларусі ў 2023 годзе павялічыўся на 3,9 %, у 2024-м — на 4 %. У 2025 годзе запланаваны рост на 4,1 %.

Учора Еўразійскі банк развіцця прадставіў новы выпуск макраэканамічнага прагнозу для краін-удзельніц на 2025—2027 гады. У краінах аперацый ЕАБР чакаецца захаванне высокай эканамічнай актыўнасці ў прагназаваным перыядзе, нягледзячы на складаныя знешнеэканамічныя ўмовы. Дзяржавы прадоўжаць актыўна абапірацца на ўнутраныя крыніцы росту, перш за ўсё на інфраструктурныя і індустрыяльныя інвестыцыі, а таксама на спажывецкі попыт, які дынамічна расце на фоне значнага павелічэння даходаў насельніцтва.

***

Аналітыкі ЕАБР таксама падзяліліся бачаннем ключавых тэндэнцый у сусветнай эканоміцы і іх уплывам на еўразійскі рэгіён. На іх думку, рост глабальнай эканомікі запаволіцца да 3 % у 2025 годзе ў параўнанні з 3,3 % у 2023—2024 гадах. Павышэнне нявызначанасці на фоне тарыфнай палітыкі ЗША і негатыўныя структурныя фактары акажуць стрымальны ўплыў на эканамічную актыўнасць у свеце. Зніжэнне спажывецкай упэўненасці і чаканняў ад бізнесу замарудзяць дзелавую актыўнасць у амерыканскай эканоміцы, дзе ВУП вырасце на 1,4 % у 2025 годзе пасля павелічэння на 2,8 % у 2024-м. У еўразоне сёлета захаваюцца слабыя тэмпы эканамічнага росту — каля 0,6 % пасля 0,9 % годам раней. Рост кітайскай эканомікі захаваецца паблізу мэтавых 5 % у 2025-м за кошт прадаўжэння палітыкі стымулявання ўнутранага попыту.

# ХТО І КУДЫ?

## У Белстаце агучылі агляд вынікаў абследавання перасячэння граніцы

**Днямі нацыянальны статыстычны камітэт апублікаваў даныя апытання, якое праводзілася на беларускай граніцы. У прыватнасці, у рамках абследавання распаўсюджана 2 001 анкета ў 4 аўтадарожных пунктах пропуску. Што паказаў аналіз?**




З агульнай колькасці распаўсюджаных анкет было запоўнена 1 033 анкеты, або 51,6 %.

Сярод асоб, якія перасякаюць мяжу, нерэзідэнты нашай краіны склалі 55,8 %. Яны запоўнілі 576 анкет. Грамадзяне Беларусі запоўнілі 457 анкет.

Найбольшая колькасць апытаных грамадзян Беларусі рухалася ў Польшчу (28,5 %), Літву (25,1 %), Іспанію (13,1 %), Германію (10,1 %).

У Беларусь у гэты ж час заязджалі пераважна рэзідэнты Літвы (42,3 %), Латвіі (12,2 %), Польшчы (11,6 %) і Расіі (11,3 %).

Большасць апытаных грамадзян Беларусі і замежных грамадзян знаходзіліся за мяжой не больш за тры дні. Такую кароткую працягласць паездкі паказалі 53,2 % рэзідэнтаў і 71,9 % нерэзідэнтаў Беларусі.

Асноўная частка апытаных адзначыла, што іх асабістыя выдаткі падчас паездкі (на такія мэты, як харчаванне, набыццё тавараў і транспартныя выдаткі) не перавысілі 500 долараў ЗША.

# НАПЕРАДЗЕ ВЯЛІКІЯ ВЫХАДНЫЯ: ЯК ПРАЦУЕМ І АДПАЧЫВАЕМ?

## У Мінпрацы расказалі, як з улікам выхадных і пераносаў будзем працаваць і адпачываць у ліпені

**Так, 3 ліпеня прыпадае на чацвер — у гэты дзень у краіне святкуюць Дзень Незалежнасці. Таму гэта дата ў нашай краіне прызнана афіцыйным выхадным.**

Працоўны дзень з пятніцы, **4 ліпеня**, пераносіцца на наступную суботу, **12 ліпеня**.

Такім чынам, атрымліваюцца чатыры беспрапынныя выхадныя дні: **3,4,5** і **6 ліпеня**.

Як патлумачылі ў Мінпрацы, у адпаведнасці з вытворчым календаром у беларусаў у ліпені пры шасцідзённым працоўным тыдні будзе **26 працоўных дзён**, а пры пяцідзённым — **22 працоўныя дні**.

**Разліковая норма працоўнага часу пры 40-гадзінным працоўным тыдні складзе:**

- для пяцідзённага працоўнага тыдня з выхаднымі днямі ў суботу і нядзелю — **175 гадзін**;
- для шасцідзённага працоўнага тыдня з выхадным днём у нядзелю — **173 гадзіны**.

**Як быць, калі на перыяд вялікіх выхадных выпадае водпуск, камандзіроўка або навучанне?**

У профільным міністэрстве растлумачылі, што калі **4 ліпеня** (пераносны дзень) прыпадае на перыяд водпуску (працоўнага, сацыяльнага) работніка, то **12 ліпеня** з'яўляецца для яго непрацоўным (выхадным) днём.

Тое самае і з часовай непрацаздольнасцю работніка (калі ён знаходзіцца на бальнічным) — **12 ліпеня** будзе для яго непрацоўным (выхадным) днём.

Непрацоўнай будзе субота, **12 ліпеня**, і для тых, хто быў прыняты на работу ў перыяд з **30 чэрвеня** да **2 ліпеня**.

Іншая сітуацыя са службовай камандзіроўкай або навучаннем (напрыклад, курсамі павышэння кваліфікацыі, падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі) — **12 ліпеня** для работніка з'яўляецца працоўным днём.

**А як быць, калі 12 ліпеня (перанесены выхадны) прыпадае на перыяд водпуску?**

У Мінпрацы адзначылі, што ў выпадку працоўнага ці сацыяльнага водпуску работніка **12 ліпеня** лічыцца днём адпачынку (непрацоўным па графіку).

Што датычыцца хвароб, то пры афармленні бальнічнага **12 ліпеня** лічыцца днём часовай непрацаздольнасці работніка.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# У БЕЛАРУСІ З'ЯВІЦЦА ЯШЧЭ АДЗІН МАБІЛЬНЫ АПЕРАТАР



**Запуск мабільнага кірунку намечаны на наступны год, паведаміў генеральны дырэктар «Белтэлекама» Аляксей ІВАШКІН: «Распрацавалі стратэгію і пачалі яе рэалізацыю. Доўга ішлі да рашэння праекта. Разглядалі абсалютна ўсе варыянты развіцця сотавай сувязі. Разумеем важнасць гэтай прапановы. Абаненты хочуць канвергентных паслуг, каб у адным пакеце была і фіксаваная, і мабільная сувязь».**

Кіраўнік кампаніі адзначыў, што цяпер праводзіцца мадэрнізацыя сетак, закупляецца «ядро». «Працуем з «Беларускімі воблачнымі тэхналогіямі» — гэта наш інфраструктурны аператар, які забяспечвае доступ да сетак 4-га, 5-га пакаленняў для вызначэння камерцыйных умоў. Як толькі ўсё будзе гатова, мы выходзім на рынак», — дадаў Аляксей Івашкін.

Усе супрацоўнікі кампаніі імкнуцца да таго, каб працэс прайшоў максімальна аператыўна, але пакуль невядома, завершыцца ён у пачатку або ў сярэдзіне 2026-га. Запуск мяркуецца ў некалькі этапаў. На першым, хутчэй за ўсё, сфарміруюць пакетную прапанову па перадачы даных. «За гэты час будзем адбудоўваць сетку, каб не было праблем. Пасля запусцім другі этап — галасавую сувязь. Плюс ёсць у рукаве некалькі козыраў, — адзначыў генеральны дырэктар «Белтэлекама». — Спадзяемся, што ў нас будуць канкурэнтныя перавагі перад дзейнымі аператарамі электрасувязі».

**Сяргей КУРКАЧ.**

Мясцовае Самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
25 чэрвеня 2025 г. № 23 (804)



ЁСЦЬ ПРАБЛЕМА

# ЦІ ТО ДАЧА, ЦІ ТО ХАТА...

## Ці магчыма перавесці «садовы» домік у жылое памяшканне, калі ён не ў садаводчым таварыстве, а ў вёсцы?

Надзея Мікалаеўна пражывае ў в. Васілінкі Слуцкага раёна. Жанчына марыць аб тым, каб перавесці свой садовы домік у «жылы», але мясцовыя ўлады не даюць на гэта дазвол. Як паведаміла жанчына, у 1992 годзе па рашэнні райвыканкама ёй індывідуальна выдзелілі ўчастак паміж жылымі дамамі ў вёсцы. «Там можна было пабудаваць садовы домік, займацца садоўніцтвам: я так і зрабіла. Плаціла падатак у сельсавет. А ў 2002-м перавезла ў Васілінкі бацькоў. Каб зарэгістраваць іх у доміку, напісала заяву ў сельсавет — маму і тату прапісалі. Ніхто тады не сказаў, што так рабіць нельга ці немагчыма». Пасля яна паспрабавала прапісаць сястру, але атрымала адмову. І вось ужо чатыры гады Надзея Мікалаеўна спрабуе вырашыць праблему, зрабіла дакументы, але ўсё без выніку. Са сваім пытаннем жанчына прыйшла на прыём да старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксея Кушнарэнкі...

У 2021 годзе да Надзеі Мікалаеўны прыехала з Украіны сястра. «Яна хацела зрабіць від на жыхарства, з гэтым пытанняў не ўзнікла. Потым я вырашыла прапісаць сястру ў садовым доміку, але мне ўжо кажуць, што па законе нельга — трэба пераводзіць садовы домік у жылое памяшканне. Пачала гэтым займацца. Чатыры гады хаджу па розных інстанцыях, каб вырашыць праблему: і ацэнку дома зрабіла, і тэхпашпарт, але толку ніякага. Нібыта няма такога закона, і кропка. Маёй маме ўжо 97 гадоў, калі яе не стане і ў доме ніхто не будзе прапісаны, мне давядзецца дорага плаціць за газ...»

Заяўніца здзіўляецца: многія цяпер, карыстаючыся «зямельнай амністыяй», узаконьваюць самавольныя пабудовы, пераводзяць нежылое памяшканне ў жылое. Чаму ёй нельга? «Кажуць, што да майго доміка гэта не адносіцца, таму што там праведзены газ, камунікацыі. Маўляў, трэба ўсё вярнуць у першапачатковы стан (а па факце разбурыць дабудаваную кухню, ванную, прыбіральню), паставіць печку. Але хіба гэта адзінае выйсце з сітуацыі?» — наракае жанчына.

Як адзначыў **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінскага аблвыканкама Аляксей НОВІКАЎ**, уся праблема ў тым, што домік заяўніцы не ўваходзіць у садовае таварыства: «Калі б яна была ў таварыстве, магла б узяць даведку ў старшыні і пасля перавесці дом у жылое памяшканне. Але ў дадзеным выпадку ў Надзеі Мікалаеўны такой магчымасці няма, бо яна атрымлівала ўчастак пад будаўніцтва індывідуальна, яе домік знаходзіцца ў межах вёскі. З іншага боку, увесці садовы домік як жылы мы таксама не можам, бо па факце гэта нямэтавае выкарыстанне ўчастка».

Ён прапанаваў прыняць у эксплуатацыю жыллё Надзеі Мікалаеўны як садовы домік: «Заяўніца возьме адпаведную даведку ў сельсавеце. Такім спосабам яна сыдзе ад факта самавольнага будаўніцтва і вырашыць пытанне аб пераводзе садовага доміка ў жылы». Аднак начальнік Слуцкага філіяла РУП «Мінскае абласное агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі і зямельным кадастры» Аляксей Бандаровец засумняваўся: ці будзе дастаткова ў дадзенай сітуацыі толькі даведкі ад сельсавета...

**«Так, на самай справе, па адміністрацыйнай працэдуры, каб зарэгістраваць самавольнае будаўніцтва ў садовым доміку, неабходная альбо даведка садаводчага таварыства, альбо рашэнне райвыканкама аб дазволе зарэгістраваць самавольныя пабудовы. Садаводчага таварыства няма. Ёсць населены пункт, у якім знаходзіцца зямельны ўчастак для вядзення індывідуальнага садаводства, таму і атрымаўся прабел. І такая сітуацыя, якую мы, згодна з дзейным заканадаўствам, закрыць не можам — няма магчымасці. А яшчэ сёння ў грамадзянкі зарэгістраваны гэты садовы домік, але ў ім ёсць самавольнае будаўніцтва. Само ж самавольнае будаўніцтва, самавольная перапланіроўка не зарэгістравана», — растлумачылі падчас прыёму грамадзян.**

«Трэба ў любым выпадку шукаць выйсце, — катэгарычны губернатар Аляксей Кушнарэнка. — Будзем ствараць прэцэдэнт на карысць Надзеі Мікалаеўны. Чалавек пабудаваў дом у адпаведнасці з заканадаўствам. Яна ж не вінаватая, што будавала домік не ў садовым таварыстве, а ў межах вёскі. Нам трэба быць ініцыятарамі заканадаўчых змен. Тым больш, калі такога роду выпадкаў нямала. Звернемся па гэтай сітуацыі ў Дзяржкаммаёмасць, будзем таксама выступаць з ініцыятывай змяненняў у заканадаўстве, паколькі падобны выпадак не адзінкавы».

Як высветлілася, такая праблема сёння існуе ў Слуцкім і Салігорскім раёнах Мінскай вобласці і ў Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.**

## У тэму

Мясцовыя органы ўлады сёння праводзяць вялікую работу для таго, каб у далейшым аказаць садзейнічанне насельніцтву ў выкарыстанні механізму «зямельнай амністыі», якая дазваляе ўзаконіць самавольна занятыя зямельныя ўчасткі. «У 2022 годзе ўступіў у сілу абноўлены Кодэкс аб зямлі. Пасля гэтага была праведзена інвентарызацыя зямельных участкаў і зверка фактычна занятых меж з юрыдычнымі. Падчас апошняй па Мінскай вобласці было выяўлена каля 120 тысяч такіх участкаў. Наперадзе — вялікая работа, але заканадаўства дазваляе займацца ёю ў спакойным тэмпе, аказваючы садзейнічанне насельніцтву ў афармленні дадзеных участкаў», — адзначыла **член Савета Рэспублікі, старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ.**



Яна таксама звярнулася да жыхароў Мінскай вобласці і парэкамендавала ім скарыстацца ўнікальнай магчымасцю ў спрошчаным парадку ўзаконіць участкі. «Гэта не проста афармленне ўчастка, але і шэраг гарантый па яго захаванні ў тым ліку пры атрыманні ў спадчыну. Устанаўленне дакладных меж участкаў з дакументальным афармленнем іх — гэта яшчэ і абарона ад зямельных спрэчак», — паведаміла кіраўнік дэпутацкага корпуса Міншчыны.

Наталля Якубіцкая падкрэсліла: «Мясцовыя органы ўлады не толькі выяўляюць самавольна занятыя ўчасткі, але і вывучаюць праблемы, якія ўзнікаюць у рэгіёнах па пытаннях землекарыстання. Гэты вопыт у будучыні можа стаць асновай для карэкціроўкі артыкулаў закона. І мы абавязкова ім скарыстаемся. Будзем працаваць, збіраць пытанні, якія сёння, можа, яшчэ не дапрацаваныя, і ўносіць змяненні ў Кодэкс аб зямлі», — падагульніла сенатар.

Дарэчы, летась Мінскім абласным Саветам дэпутатаў праводзіўся маштабны семінар, на якім старшыням сельсаветаў нацэлілі на ўзаемадзеянне грамадзян па легалізацыі і афармленні зямельных участкаў.

# НАВЯДЗІЦЕ ПАРАДАК У ЛЕСЕ!

## На гарачую лінію Дзяржкантролю людзі званілі з розных рэгіёнаў краіны

2025 ГОД ДОБРАЎПАРАДКАВАННЯ



Камітэт дзяржкантролю ў канцы мінулага тыдня правёў гарачую лінію па пытаннях навядзення і падтрымання парадку ў лясах. Паступіла больш за 20 званкоў з розных абласцей, паведамляе БелТА.

Тэматыка зваротаў: звалкі ў лесе, беспарадак на лесасеках пасля правядзення высечак. Напрыклад з Гродзенскай вобласці паведамілі аб наяўнасці ў лясным масіве звыш 10 кубаметраў (каля трох грузавых аўтамабіляў) будаўнічага смецця. Паступілі скаргі на непрыбраную бураломную драўніну. Жыхары Смалявіцкага раёна паскардзіліся на непрыбраны буралом паблізу в. Забалоцце і г. п. Зялёны Бор. Яшчэ адна агучаная праблема — дарогі, разбітыя лесагаспадарчай тэхнікай. Жыхарка Мінска паведаміла аб нездавальняючым стане пад'язной дарогі да в. Новая Мязінаўка Дзяржынскага раёна — з-за пастаяннай вывазкі драўніны лесавозамі па дарозе агульнага карыстання ўтвараюцца каляіны, якія на легкавым аўтамабілі немагчыма пераадолець.

Спецыялісты КДК з выездам на месца вывучаць усе паведамленні, якія паступілі. Па выніках будуць прыняты адпаведныя меры рэагавання.

НА КАНТРОЛІ

# НАДЗЕЙНЫ СТАНДАРТ

**На прыкладзе прадпрыемства «Магілёўліфтмаш» дэпутаты Магілёўскага аблсавета прасачылі, якія меры прымаюцца для павышэння вытворчасці імпартазамяшчальнай прадукцыі.**

Штогод у рамках падыходаў, выпрацаваных урадам па замяшчэнні ў краіну тавараў, што імпартуюцца, Магілёўскі аблвыканкам сумесна з гар-, райвыканкамамі, СЭЗ «Магілёў», суб'ектамі гаспадарання вобласці фарміруюць План мерапрыемстваў па імпартазамяшчэнні. Народныя выбраннікі прасачылі, як ён выконваецца на прыкладзе аднаго з лідзіруючых прадпрыемстваў Беларусі.

Мерапрыемства прайшло з удзелам членаў прэзідыума аблсавета, прадстаўнікоў Камітэта эканомікі аблвыканкама, асацыяцыі прамысloўцаў і прадпрымальнікаў на чале з сенатарам, старшынёй Магілёўскага аблсавета Аляксандрам Гарошкіным.

Падчас пасяджэння быў заслуханы даклад намесніка старшыні Камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Святланы Чартковай.

За перыяд з 2011-га да 2024 года вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі ў Магілёўскай вобласці павялічылася больш чым у тры разы, склаўшы па выніках 2024 года ў грашовым эквіваленце 1 мільярд 63 мільёны долараў. Колькасць арганізацый, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі мерапрыемстваў па імпартазамяшчэнні, таксама вырасла больш чым у тры разы — з 39 суб'ектаў гаспадарання ў 2011 годзе да 132 — у 2024-м. Рэалізаваны праекты па вытворчасці прадукцыі, якая раней не выраблялася або стваралася ў недастатковай колькасці.

У рэалізацыі Плана мерапрыемстваў на гэты год удзельнічаюць 140 суб'ектаў гаспадарання вобласці, у тым ліку 108 арганізацый малога і сярэдняга бізнесу. Вытворчасць імпартазамяшчальнай прадукцыі плануецца ажыццяўляць па 230 таварных пазіцыях на суму адзін мільярд 125 мільёнаў долараў, з улікам экспарту на больш чым 611 мільёнаў долараў. Па выніках работы за першы квартал заданне выканана на 101,3 % ад даведзенага ўрадам задання. Імпартазамяшчальнай прадукцыі створана на 285 мільёнаў долараў, больш за палову яе адгружана на экспарт.

— Гэта прадпрыемства было выбрана намі невыпадкова — яно адно з найлепшых у рабоце па імпартазамяшчэнні, — паведаміў карэспандэнту «МС» **член Савета Рэспублікі, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Аляксандр ГАРОШКІН.** — Вялікая частка прадукцыі, якая выпускаецца тут, сабрана выключна з беларускіх камплектуючых. Гэта яскравы доказ таго, што Беларусь можа вырабляць і цалкам забяспечваць сябе як харчовымі, так і прамысловымі таварамі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «ВАЖНА ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ І ДАПАМАГАЦЬ АДНО АДНАМУ»

У СВАЕЙ АКРУЗЕ

## Дэпутат Віталь РАКАВЕЦ лічыць, што на месцах павінны супрацоўнічаць усе органы ўлады

**У выбарчую акругу № 54, якую прадстаўляе член Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Віталь Ракавец, уваходзяць Іўеўскі, Ашмянскі раёны і частка Воранаўскага з насельніцтвам больш за 56 000 чалавек. Дэпутат падкрэслівае, што поўнасцю ўсведамляе сваю адказнасць перад выбаршчыкамі і заўсёды стараецца быць з імі ў кантакце. Напрыклад, ён правёў прыёмы грамадзян амаль ва ўсіх сельсаветах акругі, засталося ўсяго два.**



— Не кожны чалавек паедзе ў раённы цэнтр, — гаворыць ён, — па розных прычынах, таму ў сваёй рабоце практыкую выязныя прыёмы грамадзян, каб людзі маглі звярнуцца да мяне са сваімі пытаннямі. Прыемна бачыць, што выбаршчыкі давяраюць, прыходзяць па дапамогу. Нярэдка іх пытанне вырашаецца адразу на месцы, бо часта проста патрэбна кансультацыя, парада, куды лепш звярнуцца. Грамадзяне часам ідуць на прыём да мяне, абыходзячы райвыканкамы, але з іх старшынямі і намеснікамі трымаю цесную сувязь. Важна працаваць разам і дапамагаць адно аднаму. Гэта дае магчымасць аператыўна і якасна вырашаць пытанні. Пасля кожнага прыёму грамадзян абавязкова сустракаюся з кіраўніцтвам раёна, каб выказаць тое, што хвалюе насельніцтва.

Мой суразмоўца зазначае, што ў топе зваротаў заўсёды ЖКГ і сацыяльная сфера. У акрузе № 54, паводле слоў дэпутата, глабальных пытанняў, якія цяжка вырашаюцца, няма. Часам на нейкія моманты трэба больш часу, нешта чакае сваёй чаргі:

— Усё вырашальна, проста трэба разумець, што чараўніцтва не бывае, і на вырашэнне любога пытання патрэбныя рэсурсы і час. Напрыклад, у Іўеўскі райвыканкам летась паступіў зварот наконт высокіх бардзюраў на пешаходных пераходах. Так, такая праблема ёсць, многія дарогі будаваліся даўно, калі патрабаванні былі іншымі. За рашэнне пытання ўзяліся адразу, работа па заніжэнні бардзюраў ідзе і ў гэтым годзе, што дазволіць пашырыць безбар'ернае асяроддзе.

> **Злабадзённае пытанне ў сельскай мясцовасці — дарогі. Асабліва востра яно ўстае вясной, а таксама восенню, калі часта ідуць дажджы. З гэтымі зваротамі Віталь Ракавец таксама актыўна працуе.**

— Разам з кіраўніцтвам раёна і дарожнымі службамі рэагуем на звароты. Але ў цэлым у маёй акрузе праводзіцца сур'ёзная работа па добраўпарадкаванні, яна планамерная, мясцовыя ўлады сочаць за парадкам, — адзначае дэпутат. — Вырашаюцца таксама праблемы, звязаныя з кадравымі пытаннямі, сістэмай аховы здароўя, напрыклад закупкай абсталявання. Хачу адзначыць, што ў цэлым назіраю зніжэнне колькасці зваротаў. А гэта сведчыць аб тым, што работа на месцах дакладна пастаўлена і ўлады працуюць на апярэджанне. Акрамя работы са зваротамі грамадзян актыўна праводжу сустрэчы ў калектывах і бяру ўдзел у дыялогавых пляцоўках. Абавязкова пасля любой сустрэчы застаюся, каб людзі маглі асабіста задаць нейкія пытанні, бо нехта можа пасаромецца, нехта проста не хоча агучваць пры ўсіх сваю праблему. У гэтым плане заўсёды іду на сустрэчу. Імкнуся як мага часцей сустракацца з моладдзю. Яна ў нас выдатная і вельмі актыўная. Упэўнена магу сказаць, што нам будзе каму пакінуць нашу Беларусь!

Віталь Ракавец падкрэслівае, што не бывае нязначных праблем. Любая сітуацыя, якая хвалюе грамадзяніна, важная і патрабуе ўвагі. А залог якаснай працы — абавязковасць і прыстойнасць. Дэпутат звярнуў увагу на тое, што было б выдатна, каб грамадзяне больш актыўна далучаліся да заканатворчай дзейнасці, выступалі з ініцыятывамі па паляпшэнні або дапрацоўцы тых ці іншых законаў. Гэта таксама эфектыўны інструмент для паляпшэння якасці жыцця.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**


ИНФОРМАЦИЯ
о проведении повторного аукциона

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Стародорожского районного исполнительного комитета (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**изолированного помещения**

**с инв. № 645/D-5523 (наименование – детская библиотека) общей площадью 136,5 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Пушкина, 1-2.**

Начальная цена без НДС **– 27 350,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 2 735,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 50 %.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 03.04.2025.

Аукцион состоится **11.07.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.07.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8044) 789-10-18, (8029) 136-31-11.**

**Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

**УНП 690727164**



В суд Ганцевичского района Брестской области поступило заявление Федорович Ольги Владимировны об объявлении умершей Гардей Антонины Александровны, 13.12.1942 г. р., уроженки д. Малые Круговичи, Ганцевичского района, Брестской области, проживавшей и зарегистрированной по последнему месту жительства в Республике Беларусь: Брестская область, Ганцевичский район, д. Ганцевичи, ул. Пинская, д. 45.

Просьба ко всем, кто имеет сведения о Гардей А. А., сообщить их в течение двух месяцев с момента данной публикации в суд Ганцевичского района Брестской области (225432, Брестская обл., г. Ганцевичи, ул. Коммунистическая, 21).



ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321) по поручению ГП «Жилищник Минщины» (арендодатель) проводит открытый аукцион **по продаже права заключения договора аренды:**

| | **Лот № 1** | **Лот № 2** |
|---|---|---|
| Наименование объекта | **нежилые помещения № 3, 5, 6, 9, 10, 11, расположенные на 2-ом этаже в капитальном строении с инв. № 600/С-116646 (здание общежития)** | **нежилые помещения №№ 9–14, расположенные на 5-ом этаже в капитальном строении с инв. № 600/С-116646 (здание общежития)** |
| Адрес объекта | **г. Заславль, м-н Микрорайон 1, д. 3** | **г. Заславль, м-н Микрорайон 1, д. 3** |
| Площадь, кв. м | 51,5 | 36,1 |
| Срок заключения договора аренды | 3 года | 3 года |
| Начальная цена права заключения договора аренды | 241,66 бел. руб. | 169,40 бел. руб. |
| Сумма задатка | 241,66 бел. руб. | 169,40 бел. руб. |
| Размер ежемесячной арендной платы, БАВ* | 46,35 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) 869,99 бел. руб. | 32,49 БАВ (без учета коэффициента для отдельных видов деятельности) 609,84 бел. руб. |

**Аукцион состоится 14.07.2025 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с даты опубликования извещения по **10.07.2025 до 17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11, Телефон для осмотра (8017) 510-08-53, сайт в сети интернет: www.rlt.by.**

Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах **au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

УНП 691536750



ИНФОРМАЦИЯ
о проведении повторного аукциона

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Отдела идеологической работы, культуры и по делам молодежи Стародорожского районного исполнительного комитета (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

**изолированного помещения**

**с инв. № 645/D-4595 (наименование/назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 705,8 кв. м, расположенного по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Кирова, 68Б-1.**

Начальная цена без НДС **– 131 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 13 100,00** бел. руб.). **Стоимость снижена на 50 %.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущая информация опубликована в газете «Звязда» от 03.04.2025.

Аукцион состоится **11.07.2025** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.07.2025** до **17.00** по указанному адресу **в каб. 320. Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8044) 789-10-18, (8029) 136-31-11.**

**Информация о проводимом аукционе опубликована на сайтах au.nca.by, minsk-region.gov.by, rlt.by.**

**УНП 690727164**

# ВАНДРОЎКІ ГІСТАРЫЧНЫЯ — ЗНАЧЫЦЬ, ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ

## Развіццё турыстычнай сферы на месцах у Гродзенскай вобласці абмеркавалі на тэматычным семінары



На Гродзеншчыне адбыўся семінар «Роля органаў мясцовага самакіравання ў развіцці турыстычнай прывабнасці Гродзенскай вобласці на прыкладзе Навагрудскага раёна». Удзел у ім прынялі старшыні Гродзенскага абласнога, гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў. Удзельнікі абмеркавалі турыстычны патэнцыял Навагрудскага раёна, перспектывы развіцця экскурсійных маршрутаў і падзейнага турызму, а таксама ўзаемадзеянне мясцовых органаў кіравання і самакіравання ў сферы развіцця і папулярызацыі турызму. Удзельнікам мерапрыемства былі прапанаваны пазнавальныя экскурсіі па турыстычных аб'ектах Навагрудка.

Навагрудскі раён заслужана лічыцца адным з папулярных турыстычных напрамкаў у Гродзенскай вобласці. На яго тэрыторыі размешчана 86 аб'ектаў, якія ўяўляюць гістарычную і культурную каштоўнасць, а прыродныя багацці краю актыўна выкарыстоўваюцца ў сферы турызму. Гэта, а таксама многае іншае штогод прыцягвае дзясяткі тысяч наведвальнікаў.

У сваіх выступленнях **Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, і Святлана КАРАЛЬКО, старшыня Навагрудскага раённага Савета дэпутатаў**, падкрэслілі значнасць дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў павышэнні турыстычнай прывабнасці рэгіёна.

— Невыпадкова менавіта ў Навагрудскім раёне быў праведзены двухдзённы выязны семінар. Гэта зямля мае вялікае значэнне для кожнага з нас. Выхаванне патрыятызму праз вывучэнне гісторыі Навагрудчыны — важная задача, якая можа быць рэалізавана шляхам знаёмства з мясцовай гістарычнай спадчынай, выдатнымі асобамі і падзеямі, звязанымі з гэтым рэгіёнам, — адзначыла Алена Пасюта. — Падчас мерапрыемства мы як прадстаўнікі органаў мясцовага самакіравання ацанілі ролю мясцовай улады ў развіцці турыстычнай прывабнасці Навагрудскага раёна. У той жа час як турысты прайшлі па экскурсійных маршрутах і высветлілі, наколькі цікава тут пабываць.

Як падкрэсліла Святлана Каралько, у сферы турызму прымаюцца канкрэтныя захады для яе развіцця. Навагрудак можа прапанаваць турыстам разнастайныя магчымасці для адпачынку і знаёмства з мясцовымі славутасцямі. Пры гэтым органы мясцовага самакіравання адказныя за стварэнне і падтрыманне інфраструктуры, прасоўванне турыстычных рэсурсаў, падтрымку бізнесу ў турыстычнай сферы і каардынацыю работы ўсіх зацікаўленых бакоў. Дзякуючы супрацоўніцтву мясцовых улад, турыстычных арганізацый і жыхароў раёна ствараюцца ўнікальныя турыстычныя прадукты і паслугі, а таксама захоўваюцца нацыянальныя традыцыі і культурна-гістарычная спадчына.

На другі дзень семінара ўдзельнікі сабраліся ў Цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «ДАР» для правядзення дыялогавай пляцоўкі «Нам гэты мір завешчана берагчы». Абмяркоўваліся важныя тэмы: захаванне міру, выхаванне моладзі ў духу патрыятызму і павагі да нацыянальнай гісторыі, а таксама падводзіліся вынікі выязнога пасяджэння.

— Наша задача — перадаць маладым людзям вопыт старэйшага пакалення і захаваць гістарычную праўду аб падзеях тых гадоў. Нас уразіла старажытная гісторыя Навагрудскай зямлі, якую тут беражліва захоўваюць, развіты прамысловы турызм. Трэба адзначыць цікавыя падыходы ва ўзаемадзеянні служыцеляў царквы і органаў мясцовай улады. Ведаць і захоўваць гісторыю — значыць узяць на сябе адказнасць за наша мінулае, за сучаснасць і, вядома, за будучыню, — сказала Алена Пасюта.

**Вераніка КАЗЛОЎСКАЯ.**

**Фота Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў.**

# ДВОЕ ДАРОСЛЫХ І ЧАЦВЁРА ДЗЯЦЕЙ

## У Пінскім раёне ўвекавечылі памяць сям'і, якую акупанты спалілі зажыва

Невялікі помнік устаноўлены ў полі, на месцы гібелі ні ў чым не павінных людзей. Гэта была сям'я з вёскі Церабень, Таццяна і Пётр Кахновічы гадавалі чацвёра дзяцей узростам ад 6 да 13 гадоў.

Ім нават стандартнае абвінавачванне ў сувязях з партызанамі не маглі прад'явіць, бо не было ніякіх доказаў. Іх каталі паказальна, каб настрашыць іншых, знішчылі за тое, што гаспадар пасмеў пярэчыць солтысу-калабаранту. Цэлы карны атрад СС прыбыў на месца ў ліпені 1943 года. Таццяну, Пятра і іх дзяцей замкнулі ў доме на хутары, сцены абклалі саломай і падпалілі. Як указана ў паказаннях сведак дакумента, датаванага 1945 годам, да пажарышча нікога не дапускалі, пакуль там не засталося папялішча.

...Прайшло шмат гадоў, пайшлі з жыцця сведкі, і доўга пра сям'ю Кахновічаў ніхто не ўспамінаў. Але ў рабочую групу Пінскага раёна па садзейнічанні расследаванню крымінальнай справы па факце генацыду беларускага народа звярнулася жыхарка вёскі Церабень. Жанчына ўказвала на размешчаны ў полі невялікі слуп, які, паводле яе слоў, некалі паставілі ў памяць аб той трагедыі.

Інфармацыю сталі правяраць, і ў адным з архіваў знайшліся дакументы 1945 года, дзе значыліся запісы апытаняў сведак. Так высветлілі падрабязнасці той трагедыі. Інфармацыя была перададзена ў Пінскую міжраённую пракуратуру. Пазней нарадзілася ініцыятыва неабыякавых грамадзян абазначыць гэта месца мемарыяльнай дошкай, памятным знакам.




Паводле слоў **старшыні Бобрыкаўскага сельскага Савета Аляксандра БАНЦЭВІЧА**, фінансаванне сціплага абеліска, добраўпарадкаванне тэрыторыі цалкам узяло на сябе мясцовае сельгаспрадпрыемства — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сціхса Пінскае».

Замест былога цэментнага слупа ўстаноўлены тыпавы помнік з агароджай, на якім увекавечаны імёны і прозвішчы пакутнікаў. На цырымонію адкрыцця прыйшлі людзі з навакольных вёсак, школьнікі і педагогі, сваякі сям'і Кахновічаў, якая загінула ад рук карнікаў. У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Уладзімір КАЛЕСНІКОВІЧ, Пінскі міжраённы пракурор Дзмітрый ПАЗНЯК**, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота тэлеграм-канала Пінскага райвыканкама.**

# Информационное сообщение о проведении аукциона на право аренды земельного участка в г. Жодино

| | |
|---|---|
| Место расположения земельного участка и кадастровый номер | земельный участок, расположенный по ул. Труда, 9, в г. Жодино 641300000004001240 |
| Номер лота | 3 |
| Целевое назначение | для строительства и обслуживания торгового центра (код по классификатору 1 16 03 – земельный участок для размещения объектов розничной торговли) срок аренды **20 лет** |
| Площадь | **1,5360 га** |
| Условия предоставления земельного участка, характеристика расположенных на земельном участке инженерных сооружений | - без изменения целевого назначения<br>- при необходимости вынос сетей из пятна застройки<br>- организация подъездов и подходов в твердых покрытиях<br>- благоустройство прилегающей территории и строительство внеплощадочных инженерных сетей к объекту согласно проектной документации |
| Условия развития инфраструктуры застраиваемой территории | возможность подключения к инженерным сетям: водоснабжение, газоснабжение, канализация, ливневая канализация, тепловые сети, электроснабжение |
| Ограничения в использовании | площадью 1,5360 га – природные территории, подлежащие специальной охране (водоохранная зона вдхр. Жодинское)<br>площадью 0,0685 га – охранная зона линий, сооружений электросвязи и радиофикации<br>площадью 0,3928 га – охранная зона электрической сети<br>площадью 0,1716 га – охранная зона объектов газораспределительной системы |
| Начальная цена предмета аукциона, бел. руб. | **49 751,04** |
| Затраты | **8 682,66 + затраты на публикацию в СМИ** |
| Сумма задатка, бел. руб. | **4 975,10** |
| Дата проведения аукциона | **24.07.2025** |
| Последний день приёма заявлений | **18.07.2025** |
| Время проведения аукциона | **14.30** |

Подробная информация об объявленном аукционе размещена на официальных сайтах Минского облисполкома https://minsk-region.gov.by/, Государственного комитета по имуществу https://au.nca.by/ и Жодинского горисполкома https://zhodino.gov.by/.

**Контактный телефон для справок в г. Жодино 80177549093, 80177548574**

УНП 600191234

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## Извещение о проведении публичных торгов в форме электронного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор электронного аукциона** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29 |

**Предмет публичных торгов (электронного аукциона)**

**Повторные публичные торги в форме электронного аукциона. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 07.06.2025 в г. «Звязда» № 109 (30497), стр. 5.**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-51297, общей площадью 179,2 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 63 | 28 528,00 | 5 705,60 |
| 2 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-25779, общей площадью 163,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Ленина, д. 65 | 25 528,00 | 5 105,60 |
| 3 | Капитальное строение с инвентарным номером № 130/С-50804, общей площадью 307,7 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Дзержинского, д. 19/1 | 26 830,52 | 5 366,10 |
| 4 | Капитальное строение с инв. № 130/С-44847, общей площадью 193 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Дзержинского, д. 1 | 28 930,52 | 5 786,10 |

**Задаток:** 5 % от начальной цены предмета электронного аукциона.
**Шаг электронного аукциона** – 5 % от начальной цены лота (не изменяется в ходе торгов)

Информация о порядке проведения электронного аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, определении лица, выигравшего аукцион, указаны в ранее опубликованном извещении о проведении публичных электронных торгов (аукциона) в газете «Звязда» № 109 (30497) от 07.06.2025, стр. 5, а также на сайте проведения аукциона ЭТП iintorgi.by

Организатор электронного аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения электронного аукциона

**Дата и время проведения электронного аукциона:**
07.07.2025, начало электронного аукциона – 10.00, окончание электронного аукциона – 16.00. Заявки на участие в электронном аукционе принимаются с 25.06.2025 с 09:00 по 04.07.2025 г. до 16.00.
Электронный аукцион продлевается на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания электронного аукциона

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **тел: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by.** |

## Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды нежилых помещений

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

Лот 1:

### ПОМЕЩЕНИЯ со вспомогательной площадью

(коридоры, санузел) на 3-м этаже в капитальном строении, здании АТС-3, площадью 326,0 кв. м по ул. Звёздной, 3 в г. Пинске Брестской области:

1.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляет:

1БАВ * 0,25 * 326 = 81,5 БАВ.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п.7.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 16.05.2023 № 138; коэффициент – 3,0, целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

**Аукцион состоится 22 июля 2025 года в 12.00** по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».

Документы на участие в аукционе принимаются с 25 июня 2025 года по 21 июля 2025 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр-т Машерова, 21-2, каб. № 416.

Для участия в аукционе участник аукциона, в срок, установленный для приема документов:

- перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC) – AKBBBY2X, УНП 201003265.
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

**Победителем аукциона признается участник**, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

**Победитель аукциона** (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей:

– подписания протокола о результатах аукциона;
– оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды;
– возмещения затрат на организацию и проведение аукциона;
– заключения договора аренды – **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим (и) участником (ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

**Телефон для справок: (8-0162) 22-10-20,тел./факс 22-15-42.**

08 июля 2025 г. в 13.00. состоится внеочередное
общее собрание акционеров ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».
Повестка дня:

1. О досрочном прекращении полномочий членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».
2. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».
3. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ».

Местонахождение: ОАО «Чернавчицкий завод ЖБИ»: Брестский р-он, д. Чернавчицы, ул. Трудовая, 1Г.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Куйбышева, 13А 2-10, каб. 10-20.

Время регистрации в день проведения собрания: с 12.30 до 13.00.

Дата сбора реестра акционеров: 25.06.2025 г.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 25.06.2025г. (с 14.00 до 15.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 200034706

# ЗБЕРАГЧЫ АЙЧЫНУ ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

## Духоўна-патрыятычная гульня «Выратаваць мір» аб'яднала юных прыхаджан

Юныя прыхаджане храма свяціцеля Мікалая Цудатворца вёскі Лебяда Лідскага раёна і храма Раства Прасвятой Багародзіцы вёскі Мураванка Шчучынскага раёна прайшлі праз шэраг выпрабаванняў, падчас якіх давялося прадэманстраваць свае інтэлектуальныя і фізічныя здольнасці, уменне ўзаемадзеяння ў камандзе, любоў да таго куточка зямлі, дзе яны жывуць.



Арганізатары падрыхтавалі для іх няпростыя, але ў той жа час вельмі цікавыя выпрабаванні. Хлопцы і дзяўчаты з ахвотай дзяліліся ўражаннямі.

Мікалай Каласоўскі, які браў удзел у гульні трэці год запар, расказаў, што больш за ўсё яму спадабалася пісаць пасланне нашчадкам. «Мы ўдзельнічаем у гэтай гульні для таго, каб не было вайны, — сказаў хлопец. — Гэта дрэнна, калі бамбяць дамы. Калі ў чалавека згарыць жыллё, то дзе ён будзе жыць?! Невыпадкова мы пажадалі тым, хто налета будзе ўдзельнічаць у гульні, берагчы мір».

Як пераканана Соф'я Антановіч, якая прыехала да бабулі з дзядулем і з задавальненнем прыняла прапанову паўдзельнічаць у гульні «Выратаваць мір», духоўна-патрыятычная ініцыятыва вучыць згуртаванасці. «Без гэтага складана дасягнуць поспеху», — лічыць яна.

Як звярнуў увагу **настаяцель храма свяціцеля Мікалая Цудатворца іерэй Мікалай АХОТНІЦКІ**, у фармаце гульні дзеці судакранаюцца з мінулымі падзеямі, праходзячы гістарычныя пікеты, вырашаючы рэбусы, адказваючы на гістарычныя пытанні, гэтыя веды замацоўваюцца ў іх памяці.

«Легкадумна лічыць, што войны адбываюцца толькі з-за палітычных промахаў або канфліктаў грамадска-эканамічных фармацый, пэўных макраэканамічных інтарэсаў, — звярнуў увагу настаяцель храма. — Яшчэ Дастаеўскі казаў аб тым, што поле бітвы — сэрцы людзей. Будзе мір у сям'і, у суседзяў, на вуліцы, дык Гасподзь і ад вайны захавае нашу Айчыну. Алгарытм вельмі просты».

**Веранiка КАНЮТА.**
**Фота арганізатараў духоўна-патрыятычнай гульні.**

# НЕ ТОЛЬКІ ВЕЛАСІПЕДЫ

## Як ініцыятыва прадпрыемства вырасла ў адкрыты абласны спартыўны фестываль

Сёлета «Віцебскі велафэст» праходзіў пяты раз і быў прысвечаны 80-годдзю Вялікай Перамогі. Свае спартыўныя поспехі яго ўдзельнікі — амаль 450 чалавек з усёй краіны, а таксама з Расіі — прысвяцілі гэтай даце.

Да ўдзелу ў асноўных спаборніцтвах, па велакросах па перасечанай мясцовасці на розныя дыстанцыі ў розных узроставых групах, зарэгістравалася больш за 240 чалавек. Хоць самым масавым быў старт на дыстанцыю 50 кіламетраў, увагу найперш прыцягвалі адважныя байцы — удзельнікі веламарафону на 104 кіламетры. Пачатак яму роўна ў 11.00 даў старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін. Апошні з 24 веламарафонцаў фінішаваў у 19.05.



На прыазёрны двор «У Ганны», што ў вёсцы Доўжа Віцебскага раёна, сабраліся ўдзельнікі з усіх куткоў краіны, а таксама з рэгіёнаў Расіі. Многія ўпершыню, сямейнымі экіпажамі: муж і жонка, бацькі і дзеці. Адзначалі выдатныя эмоцыі, добразычлівасць арганізатараў і валанцёраў, годную арганізацыю мерапрыемства. Хоць на невялікім пятачку аднachасова сабралася мноства людзей, на дагледжанай тэрыторыі не было тлуму.

— Сёння паўсотні спартсменаў ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» бяруць удзел у першынстве самога прадпрыемства, — адзначыла **намеснік генеральнага дырэктара Раіса ЯРШОВА.** — Мы за тое, каб нашы работнікі выпрацоўвалі карысныя звычкі, былі фізічна прыгожыя і здаровыя. Да таго ж птушкафабрыка з'яўляецца асноўным спонсарам мерапрыемства і вырашае арганізацыйныя пытанні. Адным словам, задаём тон не толькі ў вытворчых дасягненнях, але і ў цікавым баўленні вольнага часу, умацаванні карпаратыўнага духу. Далучайцеся!

За два дні фестывалю прайшлі першынство Віцебскай вобласці па бегавым кросе, непасрэдна крос, у тым ліку са штучнымі перашкодамі і дзіцячы, а таксама крос-трыятлон (плаванне, веласіпед, бег). Шматлікія турніры, майстар-класы і забавы прапанавалі балельшчыкам і гасцям спартыўнага свята.

